# У СВЕЦЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

На пасяджэнні навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры», якое праходзіла ў межах Тыдня кафедры беларускага мовазнаўства, было шматлюдна: прыйшлі не толькі студэнты дзённай формы навучання, але і завочнікі, выкладчыкі, а таксама вучні сярэдняй школы № 4 нашага горада, на базе якой працуе філіял кафедры. Арганізавалі сустрэчу дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства А.С. Дзядова і стараста студэнцкага гуртка, аспірант К.С. Півавар.

Мэта заняткаў – у цікавай форме паказаць цесную сувязь роднай мовы і культуры, паглядзець на беларускае слова як на багатую крыніцу, у якой адлюстравана наша краіна, яе народ, яго характар, гісторыя, традыцыі... Таму пасяджэнне пачалося з песні пра Беларусь у выкананні студэнтак 2 курса Кацярыны Майсейчык, Яўгеніі Пудавай і Аляксандры Казловай.

Затым мы праслухалі навуковыя паведамленні, падрыхтаваныя ўдзельнікамі гуртка. Цікавыя факты пра вясельны абрад распавяла студэнтка 2 курса Надзея Радзеўская, засяродзіўшы ўвагу на адметных назвах усіх этапаў вяселля. Яе аднагрупніца Таццяна Кукуць прадоўжыла тэму і пазнаёміла прысутных з найменнямі ўдзельнікаў вясельнага абраду, пералічыла як агульнаўжывальныя, так і дыялектныя назвы.

Народныя святы – адметная частка духоўнай культуры беларусаў. Студэнтка 2 курса Анастасія Фралова расказала пра святы і прысвяткі, пра паходжанне іх назваў, а таксама пра тое, як адзначалі той ці іншы дзень нашыя продкі.

Другая частка пасяджэння была прысвечана аднаму слову, а дакладней, рэчы – беларускаму ручніку. З дапамогай выкладчыкаў свае здольнасці да навуковага пошуку праявілі студэнткі 1 курса: Анастасія Марозава, Марыя Салавей, Эліна Стрэльч, Таццяна Волкава, Анастасія Альхімовіч. Дзяўчаты распавялі пра гісторыю ручніка (ад археалагічных знаходак старажытнага ручніка, яго з'яўлення на гравюрах Ф. Скарыны да сучаснасці, калі ручнік стаў адным з нацыянальных брэндаў), яго функцыі на ўсіх важных этапах жыцця беларуса (нараджэнне, вяселле, пахаванне). Дарэчы, ручнік па сваім прызначэнні бывае розным: утылітарнай рэчу – «уціральнікам» і сакральнай – «абразнікам».



Фота К. ПІВАВАР

Запамінальным момантам пасяджэння сталі вершы пра нацыянальную рэліквію Г. Булыкі, Р. Барадуліна, Л. Геніюш, А. Пысіна, што прачыталі Уладзіслава Міхалёва, Яна Налівайка, Наталля Ермакова і аўтар дадзенага матэрыялу.

Ручнік – адзін з цэнтральных вобразаў беларускага мастацтва, у тым ліку музычнага. Праслухаўшы песню «Ручнікі» ў выкананні легендарнага ансамбля «Песняры», мы пераканаліся ў гэтым. Прыемнай нечаканасцю для ўсіх прысутных стала прапанова Кацярыны Сяргееўны зрабіць анёлкаў з ільняной тканіны. Як жа прыемна было трымаць у руках беларускі шоўк! А якія цудоўныя вырабы ў нас атрымаліся!

Напрыканцы сустрэчы Алена Сяргееўна нагадала, што беларусы славяцца гасціннасцю, і частавала ўсіх нас прысмакамі.

Шчыры дзякуй арганізатарам за цудоўна праведзены час!

**Аліна КАРПЫЗІНА, студэнтка 1 курса ФлФ.**